Салаўёў М.

# І СТАЎ ГЕРОЕМ

**Герой Савецкага Саюза Якаў Ягоравіч Сусько жыве ў Маскве. У гэтыя дні ён атрымлівае шмат віншаванняў. Яму, ураджэнцу вёскі Чарняўка Хоцімкага раёна, нядаўна споўнілася 70 год. Героя віншуюць родныя, баявыя таварышы, сябры з Ленінграда, дзе ён працаваў да прызыву ў армію. Мае кароткія нататкі прысвечаны юбілею Якава Ягоравіча.**

На савецкай зямлі другі год грымелі жорсткія баі Вялікай Айчыннай вайны. Другі год Якаў Сусько рваўся на фронт, але яму нязменна адказвалі:

– Вам для фронта даручана рыхтаваць лётчыкаў. Працуйце. Паваяваць паспееце.

І Сусько працаваў, цярпліва вучыў маладых лётчыкаў, хаця лічыў, што яго месца пад Сталінградам, дзе ішлі жорсткія баі з гітлераўцамі. Малодшы лейтэнант ведаў, што на фронт яго адпусцяць. Калі толькі?

Дзень гэты наступіў у кастрычніку 1942 года. Сусько накіравалі ў вучэбны полк для авалодання тэхнікай пілатавання самалётам ІЛ-2. На абучэнне і авалоданне матэрыяльнай часткай далі так мала часу, што Якаў з таварышамі задумаўся. Але інструктары сваю справу ведалі дасканала і праз некалькі месяцаў малодшы лейтэнант быў накіраван у 996-ы штурмавы авіяполк 224-й авіяцыйнай дывізіі.

...Аэрадром знаходзіўся непадалёку ад Калугі і з яго наносілі ўдары па ваенных аб'ектах ворага. У свой першы баявы вылет малодшы лейтэнант Сусько пайшоў у саставе звяна штурмавікоў для нанясення ўдара па станцыі Спас-Дземянск. Якаў Ягоравіч піша аб гэтым палёце: "Гэта было маё першае баявое хрышчэнне. Наш налёт быў вельмі эфектыўным – цэлы дзень, па данясеннях разведкі, на станцыі гарэлі варожыя эшалоны".

Потым паследавалі вылеты на штурм аб'ектаў і абароны ворага ў Людзінаве, Жыздры, удары па аэрадромах у Бранску, Алсуф'ева. На ўсё жыццё засталіся ў памяці Якава Ягоравіча налёты на аэрадром гітлераўцаў у Сешчы.

Было гэта ў маі сорак трэцяга года. Даўно камандаванне задумала аперацыю па знішчэнню самалётаў праціўніка на Сешчынскім аэрадроме. Для нанясення ўдара былі адабраны экіпажы лепшых штурмавікоў: свой аэрадром у Сешчы фашысты прыкрывалі вялікай колькасцю зенітнай артылерыі, заўсёды трымалі ў гатоўнасці знішчальнікі. Таму экіпажы ІЛаў на вялікай вышыні абыйшлі раён і з'явіліся над аэрадромам так нечакана, што ў праціўніка не ўспыхнуў ні адзін пражэктар, не сустрэла ні адна зенітка.

Удар па Сешчынскаму аэрадрому быў не толькі раптоўным, але і магутным. Група ІЛаў, удзельнічаючых у налёце, знішчыла 20 варожых самалётаў, скінутымі бомбамі знішчыла рэзервуары з палівам і ў поўным саставе вярнулася на свой аэрадром.

На другі дзень быў паўторны налёт. Штурмавікі, пераадолеўшы агнявы заслон ворага, абрушылі ўдар на аэрадром. Сем экіпажаў, каб даць магчымасць астатнім самалётам выканаць заданне, звязалі боем варожыя знішчальнікі.

"У другім налёце на Сешчынскі аэрадром, – расказваў Я. Я. Сусько, – мой самалёт быў моцна пашкоджан: разбіта правае крыло, выведзена са строю сістэма выпуску шасі. Яго цяжка было ўтрымліваць у гарызантальным палёце, а нямецкія знішчальнікі насядалі і атакавалі. Я знізіўся да брыючага палёту. Толькі на фоне лесу фашысты страцілі мой штурмавік з поля зроку. На аэрадром я вярнуўся на разбітым самалёце, сеў "на бруха", шасі нельга было выпусціць".

У перыяд баёў на Курскай дузе ў саставе шасцёркі Якаў Сусько вылецеў на знішчэнне варожага бронепоезда. Лётчыкі выявілі яго на ўчастку чыгункі Карачаў – Бранск, скінулі бомбы, абстралялі з пушак і кулямётаў. За выкананне гэтага баявога задання Якаў Сусько быў узнагароджан ордэнам Чырвонага Сцяга.

Пасля Курскай бітвы полк адвялі на папаўненне пад Маскву. У кожную эскадрыллю прыйшлі маладыя лётчыкі. Пасля вучобы – зноў на фронт. 996-ы авіяполк уваходзіў у састаў Бранскага, Заходняга, 1-га і 4-га Украінскіх франтоў. На чатырох франтах лётчык Сусько нямала зрабіў для разгрому ворага. Ён вадзіў самалёты – камавдаваў групамі з васьмі, дванаццаці штурмавікоў. А бывалі палёты, калі пад яго камандаваннем з аэрадрома вылятала і 20 ІЛаў.

У дні баёў за вызваленне Украіны павёў Якаў Ягоравіч групу на штурм аэрадрома ворага ў горадзе Станіславе (зараз Івана-Франкоўск). Налёт гэты быў асабліва ўдалым – 40 самалётаў спалілі і пашкодзілі Сусько і яго баявыя таварышы.

...Усё далей франтавыя дарогі вялі лётчыкаў ад родных краёў. Настаў дзень, калі грозныя ІЛы прызямліліся на нямецкай зямлі, на аэрадроме паблізу горада Глівіц. Там і сустрэў Якаў Сусько дзень 9 мая 1945 года. З таго нямецкага аэрадрома падняў ён свой штурмавік, каб пасадзіць на аэрадроме ўкраінскага горада Хмяльніцкага. Тут Якаў Ягоравіч пачуў прыемную вестку – Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 29 чэрвеня 1945 года яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У ваенным архіве захоўваецца ўзнагародны ліст: камандзір палка пісаў, што ён зрабіў 113 баявых вылетаў, знішчыў на аэрадромах 11 самалётаў ворага, 30 танкаў, 120 аўтамашын, 25 гармат, 27 мінамётаў, 45 вагонаў і 2 паравозы, узарваў тры масты, разбурыў дзве чыгуначныя станцыі.

Памятае Якаў Ягоравіч той дзень, калі ў Крамлі ў жніўні сорак пятага М. І. Калінін уручыў яму ордэн Леніна і Залатую Зорку Героя.

З 1946 года Я. Я. Сусько носіць цывільны касцюм. Спачатку ён вучыўся, працаваў у Варонежскім абкоме партыі, затым – у Міністэрстве замежных спраў СССР. Часта выступае Якаў Ягоравіч перад моладдзю, расказвае аб мужнасці савецкіх лётчыкаў, іх храбрасці ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

**Салаўёў, М. І стаў героем / М. Салаўёў // Шлях Кастрычніка (Хоцімск). — 1987. — 11 красавіка. — С. 2.**